*Л.В. Мікалаева*

# ЗМЕСТ ПАНЯЦЦЯ «ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЯ КРЫНІЦА» І СПЕЦЫФІКА ІХ КЛАСІФІКАЦЫІ

Паняцце «гістарыяграфічная крыніца» адносіцца да тых катэгорый гістарычнай навукі, якія не маюць адназначнай трактоўкі іх змету. Разам з тым прысутнічае неабходнасць большай ступені дакладнасці ў разуменні напаўнення гэтага паняцця, якое з'явілася ў лексіконе гістарыёграфаў толькі ў 1960-х гг., калі да праблематыкі гістарыяграфічных крыніц звярнуліся М.Л. Рубінштэйн[1] і С.О. Шмідт[2]. Гэта асабліва актуальна ў сувязі з тым, што без унясення тут пэўнай тэрміналагічнай яснасці вельмі складана будзе ажыццявіць зладжаную, дакладную, выверaную класіфікацыю крыніц, якія прыцягваюцца да гістарыяграфічнага даследавання. Такая выверка крыніц з'яўляецца адной з важнейшых частак метадалагічных асноў выканання гістарычных і гістарыяграфічных навуковых прац. Невыпадкова ў савецкім, а затым расійскім, беларускім, украінскім крыніцазнаўстве склалася дакладная класіфікацыя гістарычных крыніц[3], якая дазваляе разабрацца ва ўсёй іх сукупнасці, разгледзець пытанне аб значнасці кожнага з відаў крыніц у вывучэнні праблемы даследавання, высветліць, наколькі поўна яны прадстаўлены па вывучаемым пытанні. Класіфікацыя дапамагае гісторыку асэнсаваць прыцягваемыя крыніцы, устанавіць іх паўнату і вызначыць, якія віды дазволілі б больш глыбока вывучыць праблему. Яна таксама накіроўвае даследчыка на далейшы пошук неабходных матэрыялаў, а ў выпадках, калі новы пошук немагчымы – паказвае, якімі іншымі крыніцамі можна замяніць недастаючыя.

Аднак неабходна адзначыць, што класіфікацыя гістарыяграфічных крыніц, у параўнанні з гістарычнымі крыніцамі, мае сваю даволі складаную спецыфіку[4]. Не апошнюю ролю пры гэтым іграюць розначытанні ў разуменні

---

[1]Рубинштейн Н.Л. О путях исторического исследования // История СССР. 1962. №6. С. 88–114.

[2] Шмидт С.О. О методике выявления и изучения материалов по истории советской исторической науки// Труды/ Московский государственный историко-архивный институт. М., 1965. Т. 22. С. 3–49.

[3]Иванов Г.М. Исторический источник и историческое познание (Методологические аспекты).Томск, 1973; Беленький И.Л. Разработка проблем теоретического источниковедения в советской исторической науке (1960 – 1984 гг.): Аналитический обзор. М., 1985; Ковальченко И.Д. Методы исторического исследования. 2-е изд., доп. М., 2003; Санцевич А.В. Методика исторического исследования. К., 1990; Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: Учебное пособие/ И.Н. Данилевский, В.В. Кабанов, О.М. Медушевская, М.Ф. Румянцева. М., 1998;История и теория источниковедения: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования по историческим специальностям / С.Н. Ходин, В.П. Грицкевич, С.Б. Каун. Минск, 2008.

[4]Зевелев А.И. Историографическое исследование: методологические аспекты: Учебное пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности «История». М., 1987; Наумова Г.Р. О путях научного познания// История мысли : историография. М., 2002. Вып. 1. С. 3–18; Ипполитов Г.М. Классификация источников в проблемно-тематических историографических исследованиях и некоторые методологические подходы к их анализу // Известия Самарского научного центра Российской академии наук. 2011. Т. 13. № 3(2). С. 501–509; Ипполитов Г.М. Историографический факт и историографический источник как категории исторической науки: непростая диалектика // Известия Самарского научного центра Российской академии

зместу паняцця «гістарыяграфічная крыніца». Агляд навуковай літаратуры паказвае, што ў ёй без асаблівых дыскусій прымаецца сцвярджэнне аб тым, што традыцыйная гістарычная крыніца, уцягнутая ў працэс гістарыяграфічнага аналіза, набывае новы статус – гістарыяграфічнай крыніцы[5]. У той жа час погляды даследчыкаў на змест паняцця «гістарыяграфічная крыніца» далёкія ад супадзення.

У савецкай гістарыяграфіі адзін з першых поглядаў на змест паняцця «гістарыяграфічная крыніца» быў прапанаваны ў артыкуле М.Л. Рубінштэйна, які пісаў, «гістарыяграфічная крыніца аналагічная гістарычнай крыніцы у канкрэтным гістарычным вывучэнні. Але ў адрозненне ад гістарычнай крыніцы, якую мы спрабуем падвергнуць усеабдымнаму ахопу, гістарыяграфічнае даследаванне патрабуе… прадстаўнічага адбору». Гісторык разглядаўся М.Л. Рубінштэйнам як «прадстаўнік накірунка ці школы, якая аб'ядноўваецца адзінствам метадалагічных прынцыпаў даследавання і тэматычнай агульнасцю ці агульнасцю праблематыкі, адлюстроўваючай яго разуменне арганічнай сутнасці і структуры гістарычнай рэчаіснасці», пры гэтым «агульнасць накірунка не здымае індывідуальнаць гісторыка, яна павінна з яе вырастаць». Для даследчыка гістарыяграфічная крыніца – гэта непасрэдна самыя гістарычныя творы[6].

Сам тэрмін «гістарыяграфічная крыніца» прыжываўся паступова. У сваім артыкуле 1965 г. М.В. Нечкіна яшчэ выкарыстоўвала словазлучэнне «крыніцы гістарыяграфіі», множны лік якога сведчыў аб пераважнай увазе да такой яго прыкметы, як змест гэтых крыніц[7].

Між тым у тым жа 1965 г. С.О. Шмідт упершыню ў савецкай гістарыяграфіі паставіў праблему класіфікацыі гістарыяграфічных крыніц[8]. У далейшым гісторык сфармуляваў паняцце «крыніцазнаўства гістрыяграфіі» і адзначыў, што хаця галоўнымі гістарыяграфічнымі крыніцамі «прызнаюцца друкаваныя працы гісторыкаў», усё ж належыць акрэсліць больш шырокае кола «розных разнавіднасцей гістарыяграфічных крыніц»[9]. Заходзячы з такога падыходу, С.О. Шмітд прапанаваў ёмістае і лаканічнае вызначэнне гістарыяграфічнай крыніцы: «гістарыяграфічнай крыніцай можна назваць

---

наук. 2013. Т. 15. № 1. С. 184–195; Ипполитов Г.М. Историографическое исследование: характеристика источниковой базы// ЧетвертыеОзнобишинские чтения: сб. материалов Всерос. науч.-практ. конф. (19–21 мая 2006 г., Инза). Инза; Самара, 2006. С. 126–136.

[5]Ипполитов Г.М. Классификация источников в проблемно-тематических историографических исследованиях и некоторые методологические подходы к их анализу. С. 503; Ипполитов Г.М. Историографический факт и историографический источник как категории исторической науки: непростая диалектика. С. 189.

[6]Рубинштейн Н.Л. О путях исторического исследования. С. 88–114.

[7]Нечкина М.В. История истории (некоторые методологические вопросы исторической науки)// История и историки: историография истории СССР. С. 10.

[8]Шмидт С.О. О методике выявления и изучения материалов по истории советской исторической науки// Труды/ Московский государственный историко-архивный институт. С. 3–49.

[9] Шмидт С.О. Некоторые вопросы источниковедения историографии // Проблемы истории общественной мысли и историографии: к 75-летию акад. М.В. Нечкиной. М., 1976. С. 119–129.

усякую крыніцу пазнання гістарыяграфічных з'яў (фактаў)»[10]. Нягледзячы на пэўную абагуленасць, у такой трактоўцы адзначана галоўная сутнасць паняцця.

Погляд на гістарыграфічную крыніцу як на факт гісторыі гістарычнай навукі рэпрэзентаваў В.І. Дурноўцаў.Ён пісаў, што менавіта «наяўнасць гістарыяграфічнай інфармацыі ў гістарычнай крыніцы і ўцягненне яе ў сферу гістарыяграфічнага пазнання з'яўляюцца ўмовамі канстытуявання яе як крыніцы па гісторыі гістарычнай навукі»[11].

Зыходзячы з меркавання, што гістарыяграфічная крыніца – частка гістарычнай крыніцы, Л.М. Пушкароў прапанаваў наступнае вызначэнне гэтага тэрміна: «…пад гістарыяграфічнай крыніцай належыць мець на ўвазе любую гістарычную крыніцу, якая ўтрымлівае дадзеныя па гісторыі гістарычнай навукі»[12]. Даследчык катэгарычна сцвярджаў, што«…любая гістарычная крыніца, якая хаця б ускосна датычыць фактаў гістарыі гістарычнай навукі, можа быць аднесена да ліку гістарыяграфічных крыніц»[13]. Па сутнасці, Л.М. Пушкароў паспрабаваў пашырыць і паглыбіць змест катэгорыі «гістарыяграфічная крыніца».

Такое тлумачэнне выклікала пярэчанне Я.Н. Гарадзецкага, які лічыў, што гістарыяграфічная крыніца можа і не ўтрымліваць прамую гістарыяграфічную інфармацыю, але павінна адлюстроўваць «мікраклімат», г. зн. грамадскую атмасферу, якая праз шэраг пасрэдніцкіх звёнаў уплывае на развіццё гістарычнай навукі. Праведзеныя развагі і канкрэтныя прыклады дазволілі аўтару прыйсці да высновы аб тым, што «вызначэнне гістарыяграфічнай крыніцы мае патрэбу ў большай маштабнасці», яно павінна ўключаць «…матэрыялы, якія важныя і неабходныя для разумення працэса развіцця гістарычнай навукі»[14]. Такім чынам, нягледзячы на палеміку з Л.М. Пушкаровым, Я.Н. Гарадзецкі таксама выступаў за пашырэнне зместу паняцця «гістарыяграфічная крыніца».

Вынікі дыскусіі 1980-х гг. падсумаваў А.І. Зевелеў. Даледчык даволі крытычна ацаніў сучасны яму стан гістарыяграфічнага крыніцазнаўства як «этап першапачатковага накаплення ведаў», для якога характэрна нявырашанасць да канца многіх тэарэтычных аспектаў, нявысветленасць механізму «пераходу» гістарыяграфічнай крыніцы ў

---

[10] Шмидт С.О. О некоторых общих проблемах истории исторической науки// Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки:Межвуз. темат. сб.Калинин, 1980.С. 112; Шмидт, С.О. Архивный документ как историографический источник// Шмидт С.О. Путь историка: избранные труды по источниковедению и историографии. М., 1997. С. 185.

[11]Дурновцев В.И. О содержании понятия историографический факт// Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки: Межвуз. темат. сб. Калинин, 1980. С. 45, 49.

[12]Пушкарев Л.Н. Определение, оптимизация и использование историографических источников// Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки:Межвуз. темат. сб. Калинин, 1980. С. 102, 103.

[13]Там же. – С. 103.

[14]Городецкий Е.Н. О многозначности понятий «историографический факт» и «историографический источник»// Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки:Межвуз. темат. сб.Калинин, 1980.С. 120.

«ранг»гістарыяграфічнага факта, нявыпрацаванасць паняційнага апарату, адпавядаючага сучаснаму стану развіцця гістарыяграфічных ведаў.

Разам з тым А.І. Зевелеў увёў тэрмін «гістарыяграфічнае крыніцазнаўства», пад якім мелася на ўвазе «сістэма ведаў пра заканамернасці пошуку, апрацоўкі і выкарыстання крыніц, прымяняемых у гістарыяграфіі». А.І. Зевелевым было прапанавана і ўласнае тлумачэнне тэрміна «гістарыяграфічная крыніца»: «…гістарыяграфічнымі крыніцамі з’яўляюцца тыя гістарычныя крыніцы, якія вызначаюцца прадметам гістарыяграфіі і нясуць інфармацыю пра працэсы, што працякаюць у гістарычнай навуцы і ва ўмовах яе функцыянавання. Яны выкарыстоўваюцца побач з гістарыяграфічным фактам для ўстанаўлення заканамернасцей узнікнення і развіцця гістарыяграфіі»[15].

Аўтар патлумачыў, што дадзеная трактоўка абапіраецца на трыадзіную аснову: сучаснае для яго разуменне прадмета гістарыяграфіі, характарыстыку гістарыяграфічнага факта, тлумачэнне прызначэння гістарычнай крыніцы. Тым самым была ўстаноўлена залежнасць гістарыяграфічнай крыніцы ад прадмета даследавання, што замацавала стаўленне да яе як да сродка, сховішча інфармацыі. Пры гэтым А.І. Зевелеў пагадзіўся з шырокай трактоўкай паняцця «гістарыяграфічная крыніца», уключаючы ў кола крыніц і тыя, якія не нясуць прамой «гістарыяграфічнай нагрузкі», «але звязаныя з умовамі, у якіх ажыццяўляецца сацыяльная функцыя гістарычнай навукі»[16]. Такім чынам, даследчык даў важную метадалагічную ўстаноўку на тое, што гістарыяграфічная крыніца – паняцце шматаспектнае.

А.І. Зевелеў услед за А.М. Сахаравым выступіў супраць атаясамлення паняццяў «гістарыяграфічныя крыніцы» і «факты гісторыі навукі», палемізуючы па гэтым пытанні з С.О. Шмідтам. Даледчыкі пры гэтым слушна адзначылі, што ўстанаўленне факта магчыма толькі на аснове адпаведных крыніц, хаця і аддзяляць гэтыя паняцці адно ад другога таксама нельга[17].

А.І Зевелеў вызначыў адрозненні паміж гістарыяграфічнымі крыніцай і фактам. Ён засведчыў, што гістарыяграфічны факт па сваёй функцыянальнай нагрузцы шырэй, чым гістарыяграфічная крыніца, а кола апошніх адпаведна больш вузкае, чым гістарыяграфічныя факты[18].

Такім чынам, абагульняючы інфармацыю па савецкім этапе ў распрацоўцы праблематыкі, можна адзначыць шэраг яго характэрных рыс. Савецкая гістарыяграфія ўвасабляла ў сабе тыповыя рысы класічнай навукі з яе аб’ктывісцкай арыентацыяй на пазнанне інварыянтнай гістарычнай рэальнасці. Натуральна мелася на ўвазе, што працы вучоных павінны ў

---

[15]Зевелев А.И. Историографическое исследование: методологические аспекты.С. 119.
[16]Там же. С. 120.
[17]Зевелев А.И. Историографическое исследование: методологические аспекты. С. 94–95; Сахаров А.М. О некоторых вопросах историографии историографических исследований// Вестник Московского университета. Серия история. 1973. № 6. С. 22.
[18]Зевелев А.И. Историографическое исследование: методологические аспекты. С. 121–122.

цэлым яе адэкватна адлюстроўваць. Адсюль паўставала ўвага да гістарыяграфічных крыніц як да пасрэднікаў вывучэння той адзінай ральнасці. Гісторык жа павінен быў аднавіць карціну мінулай рэчаіснасці і пазнаёміць з ёй астатніх. Сканцэнтраваўшы сваю ўвагу на «змесце» гістрыяграфічнай крыніцы, тэарэтыкі не ставілі перад сабой задачу вывучэння яе «прыроды».

У пачатку XXI ст. абазначыліся сробы канструявання новага бачання зместу паняцця «гістарыяграфічная крыніца» з улікам сацыякультурнага асяроддзя, якое ўплывае на працэс стварэння гістарычных ведаў. Украінскі даследчык А.Б. Воўк некалькі канкрэтызаваў заўвагі А.І. Зевелева, сцвярджаючы, што «гістарыяграфічнай крыніцай можна лічыць помнік мінулага, які прадстаўляе даследчыку інфармацыю аб заканамернасцях развіцця гістарычных ведаў і гістарычнай навукі, г. зн. аб самім прадмеце гістарыяграфічных даследаванняў. Такім чынам, да катэгорыі гістарыяграфічных крыніц можна аднесці рознатыпныя гістарычныя крыніцы, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра творчасць і жыццё вядомых гісторыкаў, пра ўзнікненне і развіццё гістарычнай адукацыі і навукі, пра характэрнае для кожнай эпохі палітычнае і навуковае мысленне»[19].

Расійскія даследчыкі В.П. Корзун, С.П. Бычкоў канстатавалі, што «гістарыяграфічная крыніца становіцца такой толькі тады, калі ўключаецца ў адносіны «крыніца-гісторык», у працэдуру гістарыяграфічнага аналіза»[20]. Пры гэтым яны пагадзіліся з меркаваннем С.В. Чыркова аб падыходзе да гістарыяграфічнай крыніцы з улікам навуказнаўчага прынцыпу трохаспектнасці навукі, «згодна з якім у любой навуковай з'яве неабходна, акрамя прадметнага боку (у дадзеным выпадку – развіцця гістарычнай думкі), бачыць бакі сацыяльны і індывідуальна-псіхалагічны (маецца на ўвазе – псіхалогія творцы навукі)»[21].

Расійскія даследчыкі У.Д. Камынін і А.А. Цыпіна працягнулі роздум у гэтым напрамку, мяркуючы, што «разглядаючы асноўную гістарыяграфічную крыніцу ў такіх трох аспектах, мы па сутнасці разглядаем яе як сацыякультурную практыку і вымушаны выйсці за рамкі гістарыяграфічнага факта ў шырокае культуралагічнае поле»[22].

Сучасны ўкраінскі гісторык А.М. Астранка звярнуў увагу на той момант, што асобае «месца ў корпусе гістарыяграфічных крыніц належыць

---

[19]Вовк О.Б. Терминологические проблемы историографии: историографический факт и историографический источник. С. 53.

[20]Бычков С.П. Введение в историографию отечественной истории XX в. Учебное пособие. Омск, 2001. С. 40.

[21]Чирков С.В. Об источниковедении историографии// Мир источниковедения: Сборник в честь СигурдаОттовича Шмидта. М., 1994. С.403–409.

[22]Камынин В.Д. Проблема историографического источника в отечественной литературе// Запад, Восток и Россия: проблема исторического и историографического источника. Екатеринбург, 2005. Вып. 7. Проблемы всеобщей истории. С. 17–26.

ego-дакументам, прадстаўленым лістамі, мемуарамі і аўтабіяграфіямі гісторыкаў»[23].

Звяртаючыся да пытання аб вызначэнні гістарыяграфічнай крыніцы, сцыялісты ў галіне гістарыяграфіі не пакідаюць ў баку і т. зв. «праблемную гістарыяграфію». Напрыклад, Г.М. Іпалітаў, пагадзіўшыся з фармуліроўкай гістарыяграфічнай крыніцы, дадзенай А.Б. Воўк, удакладніў, што «калі весці размову аб праблемна-тэматычнай гістарыяграфіі, да гістарыяграфічных крыніц можна аднесці наогул усе публікацыі і рукапісныя працы, якія маюць адносіны да тэмы, што стала аб’ектам і прадметам праблемна-мэматычнага даследавання, а не толькі featурознатыпныя гістарычныя крыніцы, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра творчасць і жыццё вядомых гісторыкаў, пра ўзнікненне і развіццё гістарычнай адукацыі і навукі, пра характэрнае для кожнай эпохі палітычнае і навуковае мысленне»[24].

Такім чынам, у прыведзеных вышэй прыкладах можна заўважыць імкненне ўдакладніць ранейшыя погляды на гістарыграфічную крыніцу, уключыўшы ў фармуліроўкі аспекты ўплыву на дзейнасць даследчыка сацыякультурнага асяроддзя. Гэта абумовіла ўвагу да індывідуальных, сацыяльна-псіхалагічных аспектаў творчасці, якія зафіксаваныя ў першую чаргу ў крыніцах асабістага паходжання. Розніца з папярэдняй парадыгмальнай устаноўкай бачыцца перш за ўсё ў тым, што ад ацэначнай характарыстыкі знешняга асяроддзя гістарыёграфу прапаноўваецца перайсці да характарыстыкі функцыянальнай і ўспрымаць яе як неабходную зададзенасць. Акрамя таго, як адзначыў С.І. Малавічка, нягледзячы на шматлікія ўдакладняючыя дэталі, усе прыведзеныя вышэй вызначэнні паняцця «гістарыяграфічная крыніца» аб’ядноўвае агульны падыход, заснаваны на пашыральным тлумачэнні тэрміна «за кошт уключэння ў паняцце «гістарыяграфічная крыніца» гістарычных крыніц іншых відаў (напрыклад, дакументацыі навукова-даследчых арганізацый, крыніц асабістага паходжання і інш.)». На думку даследчыка, такі падыход да гістарыяграфічнай крыніцы, а больш шырока, да функцыі крыніцазнаўства гістарыяграфіі, «змякчае дэканструіруючы – у адносінах да гістарычных ведаў – эфект гісторыі гісторыі, не дазваляе ажыццяўляць рэфлекцыю ў граніцы паміж навуковай гісторыяй і іншымі формамі гістарычных ведаў»[25].

У якасці лагічнага развіцця намеціўшайся трансфармацыі ў разуменні гістарыяграфічнай крыніцы можна разглядаць канцэпцыю М.Ф. Румянцавай і С.І. Малавічка. У рамках пераасэнсаванай імі дысцыпліны крыніцазнаўства гістарыяграфіі аўтары прапанавалі вузкую трактоўку паняцця «гістарыяграфічная крыніца». Адштурхоўваючыся ад тэарэтычнага ўяўлення

[23]Острянко А.Н. Источниковедение историографии в свете междисциплинарных исследований // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зборнік. Мінск, 2011. Вып. 6. С. 35.
[24]Ипполитов Г.М. Историографический факт и историографический источник как категории исторической науки: непростая диалектика. С. 189.
[25]Маловичко С.И. Проблема классификации источников в предметном поле источниковедения историографии// Вестник Нижегородского университета им. Н.И. Лобачевского. 2015. № 2. С. 39.

аб крыніцы як «аб'етыўным выніку творчай дзейнасці чалавека», яны вызначылі ў якасці гістарыяграфічнай крыніцы толькі «творы гістарыкаў, якія рэалізуюць функцыі прэзентацыі і пазіцыянавання гістарычных ведаў, як навуковых, так і сацыяльна арыентаваных»[26]. У адпаведнасці з гэтым, на погляд аўтараў, «аб'ектам крыніцазнаўства гістарыяграфіі з'яўляецца сістэма відаў гістарыяграфічных крыніц (твораў гісторыкаў), а прадметам – нараджэнне і функцыянаванне гістарыяграфічнай крыніцы ў навуковым пазнанні і іншых сацыяльных практыках»[27].

Такім чынам, у прыведзенай трактоўцы паняцця «гістарыяграфічная крыніца» адбываецца адмова ад увагі толькі да зместу катэгорыі, і як наступства, ад спажывецкага стаўлення да крыніцы. І гэта ўзбагачае разуменне апошняй як прадукта культуры. Становіцца відавочнай іншая парадыгмальная ўстаноўка, у якой бачныя канструктывісцкія элементы.

З другога боку, прапанаваная дэфініцыя ўтрымлівае і нявырашаныя праблемы. Так, Н.М. Алеўрас, робячы каментарый гістарыяграфічнай крыніцы як «базавага паняцця крыніцазнаўства гістарыяграфіі», заканамерна задаецца пытаннем аб тым, наколькі прадуктыўным будзе вузкае яго разуменне ў такой дысцыпліне як гістарыяграфія ў цэлым, прадметная прастора якой значна больш шырокая[28]. У пазітыўнай частцы сваіх разваг Н.М. Алеўрас абапіраецца на меркаванне В.М. Медушэўскай, што розныя прыметнікі да назоўніка «крыніца» кажуць не пра яе прыроду, а пра сферу даследчыцкага інтарэса. Змяшчаючы гістарычныя веды ў цэласную прастору гуманітарных ведаў, на думку гістарыёграфа, можна абыйсціся і без прыметнікаў «гістарычная» і «гістарыяграфічная», паколькі «вынікі навуковай дзейнасці гісторыкаў знаходзяцца ў агульнай сукупнасці інтэлектуальных прадуктаў сістэмы інфармацыйнага рэсурса гуманітарыстыкі»[29].

Такім чынам, становіцца відавочным, што актуалізавалася наступнае пытанне: творы гісторыкаў – гэта галоўная, адна з, адзіная гістарыяграфічная ці проста крыніца? Спроба вярнуць у цэнтр гістарыяграфіі навуковую ідэю ў рамках канцэптуалісцкага падыходу не ўсімі можа быць падтрымана, паколькі пашырылася яе аб'ект-прадметная прастора (вынікі інтэлектуальнай дзейнасці вучоных, арганізацыйная інфраструктура, сацыякультурны кантэкст, жыццёвы свет т г.д.). Даследчыцкія ж практыкі гістарыёграфаў, якія ўсё больш ахвотна карыстаюцца і ўводзяць у навуковы зварот

---

[26]Маловичко С.И. Источниковедение историографии как предметное поле интеллектуальной истории// Мир историка: историографический сборник. Омск, 2017. Вып. 11. С. 89; Маловичко С.И. Проблема классификации источников в предметном поле источниковедения историографии. С. 39.

[27]Маловичко С.И. Источниковедение историографии/ С.И. Маловичко, М.Ф. Румянцева// Теория и методология исторической науки: Терминологический словарь. М., 2014. С. 203; Маловичко С.И. Проблема классификации источников в предметном поле источниковедения историографии. С. 39–40.

[28]Алеврас Н.Н. Источниковедение историографии и историографический источник в контексте источниковедческой парадигмы как повод для историографических заметок и размышлений//Мир историка : историографический сборник. Омск, 2017. Вып. 11. С. 105–106.

[29]Там же. С. 116–117.

дакументы асабістага паходжання гісторыкаў, паказваюць, што для іх вузкае разуменне гістарыяграфічнай крыніцы будзе хутчэй контрпрадуктыўным.

Са сказанага вышэй можна зразумець, што дыскусія пра напаўненне паняцця «гістарыяграфічная крыніца» выйшла на новы віток і ў бліжэйшы час не будзе вырашана адназначна. Апошняе актуалізуе праблему класіфікацыі гістарыяграфічных крыніц. У наш час можна вызначыць шэраг поглядаў даследчыкаў на яе.

На думку Л.М. Пушкарова, класіфікацыйная схема, выпрацаваная савецкім крыніцазнаўствам, у пэўнай меры прыкладальная да гістарыяграфічных крыніц. Канкрэтная ж класіфікацыя будзе залежаць ад мэтаў, якія ставіць перад сабой гістарыёграф[30]. Можна пагадзіцца з С.І. Малавічка, што, па сутнасці, тут ідзе размова аб сістэматызацыі, а не аб класіфікацыі гістарыягафічных крыніц, паколькі прадугледжваецца толькі актыўная пазіцыя даследчыка і цалкам ігнаруецца свядомы выбар гісторыка мінулага і культура, у якую быў уключаны яго твор[31].

З поглядам Л.М. Пушкарова не пагаджаўся Я.Н. Гарадзецкі, які лічыў, што пры такім падыходзе страчваецца аб’ектыўная аснова класіфікацыі гістарыяграфічных крыніц[32].

Відавочна, што ў многім з’яўленне названых розначытанняў абумоўлена тым, што для гістарыяграфічных крыніц, у адрозненне ад гістарычных, пакуль не ўстаноўлены адносна выразныя крытэрыі, якія належыць пакласці ў аснову іх класіфікацыі. Акрамя таго, дадзеная праблема ўскладняецца яшчэ адной акалічнасцю: па меры развіцця гістарыяграфіі ўсё больш пашыраецца кола гістарыяграфічных крыніц.

Характарызуючы існуючыя класіфікацыі гістарыяграфічных крыніц, можна адзначыць адрознасць аўтараў у падыходах да іх складання. У савецкай гістарыяграфіі традыцыйным быў жанравы падыход пры класіфікацыі такіх гістарыяграфічных крыніц, як творы гісторыкаў. У1960-х гг. яго прымянялі О.Л. Вайнтшэйн[33] і М.В. Нечкіна[34]. У наш час жанры гістарычных прац часам выдзяляюць аўтары дысертацый па гістарыяграфіі, крыніцазнаўству і метадах гістарычнага даследавання[35].

Некаторыя гісторыкі лічылі мэтазгодным падзяліць творы гісторыка на тыпы, да якіх можна аднесці: 1) навуковыя работы; 2) гістарычную вучэбную

---

[30]Пушкарев Л.Н. Определение, оптимизация и использование историографических источников// Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки:Межвуз. темат. сб. С. 103.
[31]Маловичко С.И. Проблема классификации источников в предметном поле источниковедения историографии. С. 40.
[32]Городецкий Е.Н. О многозначности понятий «историографический факт» и «историографический источник» // Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки: Межвуз. темат. сб.С. 121.
[33]Вайнштейн О.Л. Западноевропейская средневековая историография. М.-Л., 1964. С. 457.
[34]Нечкина М.В. История истории (некоторые методологические вопросы исторической науки)// История и историки: историография истории СССР. М., 1965. С. 10.
[35]Маловичко С.И. Проблема классификации источников в предметном поле источниковедения историографии. С. 40.

літаратуру; 3) крыніцы, якія утрымліваюць інфармацыю пра жыццё і творчасць гісторыкаў і г.д.[36]

У сваёй працы А.І. Зевелеў таксама прывёў класіфікацыю, якая ўтрымлівала наступныя віды гістарыяграфічных крыніц: 1) работы гісторыкаў (кнігі і артыкулы); 2) дысертацыйныя даследаванні; 3) тэксты лекцыйных курсаў, частка якія паслужыла асновай гістарыяграфічных даследаванняў; 4) чарнавікі неапублікаваных рукапісаў, карэктуры; 5) дзённікі, мемуары, аўтабіяграфіі, анкеты; 6) лісты; 7) вучэбныя праграмы і справаздачы па прачытаных курсах гістарыяграфіі; 8) матэрыялы перыядычнага і неперыядычнага друку (рэфератыўныя агляды, рэцэнзіі, бібліяграфічныя агляды, матэрыялы дыскусій); 9) матэрыялы работы канферэнцый, сімпозіўмаў і іншых форумаў па праблемах развіцця гістарычнай навукі, а таксама метадалогіі гістарыяграфіі; 10) масавыя крыніцы[37]. Як бачна, для свайго часу гэта была дастакова распрацаваная класіфікацыя, якая імкнулася ахапіць усю шматлікасць гістарыяграфічных крыніц. Хаця некаторыя яе аспекты не былі яшчэ добра прапрацаваны.

У XXI ст. гістарыёграфамі таксама ствараліся класіфікацыі гістарыяграфічных крыніц. Так, дыферцыруючы ўвесь корпус гістарыяграфічных крыніц, В.П. Корзун прапанавала выдзяляць у ім асноўную (творы гісторыкаў) і дапаможную (крыніцы для стварэння атмасферы эпохі) групы[38]. Падаецца, такі падыход з’яўляецца занадта агульным.

Г.М. Іпалітаў у праблемна-тэматычных гістарыяграфічных даследаваннях падзяліў усе гістарыяграфічныя крыніцы на два буйныя блокі: 1) гістарыяграфічныя крыніцы і 2) гістарычныя крыніцы, якія выкарыстоўваюцца ў гістарыяграфічным даследаванні. У сваю чаргу ў межах кожнага блока даследчык выдзеліў шэраг груп крыніц. У блоку гістарыяграфічных крыніц ім былі вызначаны: 1) абагульняючыя і спецыяльныя даследаванні; 2) спецыяльныя дысертацыяныя даследаванні; 3) навуковыя артыкулы; 4) матэрыялы навуковых канферэнцый і іншых навуковых форумаў; 5) агляды літаратуры, рэцэнзіі; 6) навукова-бібліяграфічныя публікацыі. У блоку гістарычных крыніц даследчык адзначыў наступныя групы: 1) архіўныя і апублікаваныя дакументы; 2) эгакрыніцы (мемуары, дзеннікі, эпісталярыі); 3) матэрыялы перыядычнага друку[39]. З улікам складанасці і спецыфічнасці крыніц, прымяняемых у гістарыяграфічных працах праблемна-тэматычнага характару, падаецца, што

---

[36]Волин И.С. О разнотипности историографических источников// Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки:Межвуз. темат. сб.С. 122–123.

[37]Там же. С. 127–131.

[38]Бычков С.П. Введение в историографию отечественной истории XX в. Учебное пособие/ С.П. Бычков, В.П. Корзун.Омск, 2001. С. 40.

[39]Ипполитов Г.М. Классификация источников в проблемно-тематических историографических исследованиях и некоторые методологические подходы к их анализу. С. 503–506.

прапанаваная Г.М. Іпалітавым класіфікацыя яшчэ патрабуе далейшай дапрацоўкі.

Прыхільнікі фенаменалагічнай канцэпцыі крыніцазнаўства гістарыяграфіі С.І. Малавічка і М.М. Румянцава таксама распрацавалі сваю класіфікацыю гістарыяграфічных крыніц. У аснову яе, па словах аўтараў, быў пакладзены прынцып мэтапалагання, які дазваляе выдзеліць наступныя віды гістарыяграфічных крыніц, у якіх рэпэзентуюцца гістарычныя веды: 1) манаграфіі; 2) артыкулы; 3) дысертацыі; 4) тэзісы; 5) гістарычныя нарысы; 6) рэцэнзіі, 7) вучэбныя дапаможнікі. Па тыпу прадстаўленых у гістарыяграфічных крыніцах гістарычных ведаў аўтары палічылі мэтазгодным пядзяліць іх на дзве групы: 1) групу відаў гістарыяграфічных крыніц навуковай гісторыі; 2) групу відаў гістарыяграфічных крыніц сацыяльна арыентаванага гістарыяпісання. Прымяняць такую класіфікацыю аўтары прапаноўваюць толькі да твораў гісторыкаў XIX – пачатку XXI ст.[40].

На наш погляд, прыведзеныя класіфікацыі маюць пэўныя рысы, якія патрабуюць выпраўлення ці ўдакладнення, паколькі не ахопліваюць новыя віды гістарыяграфічных крыніц, якія з’явіліся па меры развіцця інфармацыйных тэхналогій. Мяркуем, што найбольш удалай будзе выглядаць відавая класіфікацыя гістарыяграфічных крыніц, у якой можна выдзеліць наступныя віды: 1) манаграфічныя даследаванні;2) абагульняючыя фундаментальныя працы; 3) артыкулы;4) апублікаваныя матэрыялы канферэнцый, сімпозіўмаў, семінараў і іншых навуковых форумаў, на якіх адбывалася калектыўнае абмеркаванне актуальных праблем гісторыі;5) дысертацыйныя працы, тэксты лекцый, вучэбныя праграмы, метадычныя рэкамендацыі па курсах гістарыяграфіі;6) падрыхтоўчыя матэрыялы, чарнавікі неапублікаваных рукапісаў, дзённікі, мемуары, аўтабіяграфіі, анкеты, лісты, некралогі; 7) масавыя крыніцы: статыстычныя матэрыялы, адлюстроўваючыя развіццё гістарычнай навукі: дадзеныя па колькасці выпускнікоў гістарычных факультэтаў, абароненых дысертацый, апублікаваных манаграфій і артыкулаў, перыядычнасць выдаваемых спецыялізаваных часопісаў;8) кіна-фота-фона-гістарычныя крыніцы, якія ўтрымліваюць гістарыяграфічную інфармацыю; 9) Інтэрнет-рэсурсы, якія адлюстроўваюць узровень развіцця гістарычных ведаў: форумы, дыскусіі, аператыўны абмен меркаваннямі.

Такім чынам, у наш час многія метадалагічныя аспекты, звязаны з аналізам і ацэнкай гістарыяграфічных крыніц, пытаннямі іх класіфікацыі па-ранейшаму застаюцца ў дыскусійным полі. Можна адзначыць пэўнае адставанне гістарыёграфаў у даследаванні названых пытанняў.

---

[40]Маловичко С.И. Проблема классификации источников в предметном поле источниковедения историографии. С. 41.